ГАЗЕТА З БЕЛАРУСІ

# ГОЛАС РАДЗІМЫ

ВЫДАЕЦЦА З 1955 ГОДА ● ● NO. 47 (3503) ● ● ЧАЦВЕР, 15 СНЕЖНЯ, 2016

ШТОТЫДНЁВІК "ГОЛАС РАДЗІМЫ" МОЖНА ЧЫТАЦЬ У ІНТЭРНЭЦЕ: WWW.GOLAS.BY



**Суседзі па Дзвіне**

Стар. 2



**Павіншавалі на роднай мове**

Стар. 3



**Карцін святочны феерверк**

Выставаў "Уражанні беларускіх мастакоў у Балтыі" адзначыла свой 25-гадовы юбілей у Рызе вядомая творчая суполка "Маю гонар" Стар. 4

СВЯТА

# Цвяток радзімы васілька

## Сёлета на 125-я ўгодкі Максім Багдановіч быццам сімвалічна вярнуўся на Радзіму з Ялты



БЕЛТА

**Ля помніка паэту ў Мінску гучаць яго вершы**

**Кацярына Мядзведская**

**"...З вамі вярнуся да хаты я..."**

Народная артыстка Беларусі Тацяна Мархель, якая працуе ў Рэспубліканскім тэатры беларускай драматургіі, удзельнічала ў праекце "Чытаем Багдановіча разам". І перад тым як прадэкламаваць верш "У краіне светлай, дзе я ўміраю...", яна расказвала: "Калі некалькі год таму адпачывала ў санаторыі ў Ялце, штодзень ураніцу хадзіла на магілу Максіма Багдановіча, прынасіла кветкі — калі ружы, гваздзікі, а калі й палявыя. І так хацелася нарваць васількоў з родных мясцін..."

У Ялту Максім Багдановіч, як вядома, паехаў лячыцца: бо хварэў на сухоты. Шмат планаў было ў паэта, надзей, спадзяванняў... Але ўвасобіць іх у жыццё не змог. Лячэнне ўжо не дапамагло, і 25 мая 1917 года ў 25-гадовым узросце Максім Багдановіч памёр. Пахавалі яго на гарадскіх могілках. Сярод папер, знойдзеных пасля смерці паэта, была кніга з кароткім вершам, які ён напісаў у апошнія гадзіны: "У краіне светлай, дзе я ўміраю, /У белым доме ля сіняй бухты, /Я не самотны, я кнігу маю/ З друкарні пана Марціна Кухты". Ведаў паэт, што жыць яму адведзена нядоўга, і вельмі хацеў ён быць пахаваны ў беларускай зямлі. Аднак лёс склаўся інакш...



БЕЛТА

**І сёння моладзь захапляецца творамі Максіма Багдановіча**

9 снежня, у Дзень нараджэння класіка беларускай літаратары, у крыпце мінскага Храма-помніка ў гонар Усіх Святых прайшла цырымонія "Вяртанне". Намесніца Прэм'ер-міністра Беларусі Наталля Качанава зачытала вітальны ліст Прэзідэнта Аляксандра Лукашэнкі ўдзельнікам урачыстасцяў: "Дарагія сябры! Сардэчна віншую вас з 125-годдзем з Дня нараджэння Максіма Багдановіча — нашага сусветна вядомага і паважанага паэта. Яго вытанчаныя, дасканалыя вершы, якія вызначаюцца майстэрскім выкарыстаннем вобразна-выяўленчых сродкаў, пранікненнем у духоўны свет чалавека і высокай культурай слова, па праву прызнаны адной з вяршынь еўрапейскай паэзіі XX стагоддзя. Сваёй дзейнасцю пясняр заклаў падмурак беларускай нацыянальнай эстэтыкі, унёс вялікі ўклад у фарміраванне літаратурнай мовы і станаўленне патрыятычнай свядомасці народа. Таму сёння мы, грамадзяне суверэннай дзяржавы, павінны шанаваць і захоўваць тое, дзеля чаго працаваў наш знакаміты зямляк, — гістарычную памяць, роднае слова, моцную краіну".

Пасля ў адну з ніш нацыянальнага пантэона змясцілі капсулу з зямлёй з магілы паэта. Духоўныя асобы краіны спецыяльна ездзілі дзеля гэтага ў Ялту. На ўрачыстай цырымоніі Міністр культуры Беларусі Барыс Святлоў адзначаў: "Узяцце зямлі з магілы паэта і захаванне капсулы на Радзіме — выкананне волі Максіма Багдановіча". Затым у Белай зале храма прайшло мемарыяльнае літаратурнае чытанне.

→ Стар. 2

ВЕСТКІ

## Вучыцца? Калі ласка!

**Беларусь і Польшча будуць прымаць на навучанне ў ВНУ да 20 чалавек, якія належаць да нацыянальных меншасцяў**

Сёлета, выступаючы на V Усебеларускім народным сходзе, намеснік старшыні праўлення Беларускага грамадска-культурнага таварыства ў Польшчы Базыль Сегень адзначаў: "Беларусы Польшчы хацелі б вярнуцца да былой практыкі — прыёму ў беларускія ВНУ моладзі з ліку беларускай нацыянальнай меншасці".

І вось напрыканцы лістапада Палата прадстаўнікоў Беларусі ратыфікавала беларуска-польскае міжурадавае пагадненне аб супрацоўніцтве ў сферы адукацыі. Сярод мноства кірункаў узаемадзеяння ёсць і такі: штогод на ўмовах парытэту Беларусь і Польшча могуць прымаць на навучанне ў ВНУ да 20 чалавек, якія належаць да нацыянальных меншасцяў. Па словах дырэктара Культурнага цэнтра Беларусі ў Варшаве Міхаіла Рыбакова, падпісанне пагаднення — значны крок у развіцці двухбаковых адносінаў. "З 2005 года, пасля канфлікту вакол Саюза палякаў Беларусі, у беларускія ВНУ з краіны-суседкі анічто не паступаў, — адзначае Міхаіл Рыбакоў. — Пры наяўнасці беларускага дыплома ў Польшчы можна працягваць навучанне, напрыклад, у магістратуры, але для ўладкавання на працу трэба прайсці настрыфікацыю — пацвердзіць дыплом па еўрапейскай праграме навучання. Гэта — складаная сістэма, звязаная з Балонскім працэсам і тычыцца ўсіх краін ЕС".

Увогуле пагадненне адкрывае новыя магчымасці для сістэмнага, шматбаковага супрацоўніцтва дзвюх краін у сферы адукацыі. Улічаны пры тым інтарэсы беларусаў у Польшчы і палякаў у Беларусі.

ЛІНІЯ ЖЫЦЦЯ

# У танцы раскрываецца душа

**Кацярына Мядзведская**

**Вядомы балетмайстар, харэограф, выкладчык Белдзяржуніверсітэта культуры і мастацтваў Мікола Котаў і ў свае 75 — танцуе!**

Юбілейная імпрэза, цёплая сустрэча, на якую прыйшлі яго сябры, вучні, калегі, артысты, паплечнікі-аднадумцы, ладзілася ў Цэнтры сацабслугоўвання насельніцтва Маскоўскага раёна Мінска. Там у Тэатра фальклору "Матуліна хата", якім кіруе юбіляр, ёсць пакойчык, зала для рэпетыцый. Згадваў сцежкі-дарогі, пройдзеныя разам, кінааператар Сяргей Яноўскі. А фільмы пра абрады, святы, спевы неаднойчы ішлі па тэлебачанні. І фатограф Васіль Кулікоў цёпла казаў пра сябра, з якім даўно супрацоўнічае, вядзе своеасаблівы летапіс жыцця і творчасці Міколы Кананавіча. Згадвалі агульныя добрыя справы, праекты пісьменнік Валеры Сарока, журналіст Яўген Крыцкі, заснавальніца Дабрачыннага фонду "Дзецям Чарнобыля" Валянціна Смольнікава з Буда-Кашалёва. Быў на дні нараджэння нават генерал у адстаўцы: Алег Кучэўскі. "Наш верны глядач, разам з намі ездзіць на выступленні, часта запрашае да сябе ў госці, — кажа юбіляр. — Душа яго цягнецца да творчасці, а мы заўсёды рады такім людзям". Віншавалі кіраўніка музыкі ды спявачкі з "Матулінай хаты", прадстаўніцы Адміністрацыі Маскоўскага раёна Мінска...

Слухаючы гісторыі знаёмстваў, агульных спраў, згадала, як сустрэлася з Міколам Котавым гадоў 10 таму, пад час выставы "СМІ ў Беларусі". Ён тады спевамі, бубнам, танцамі-жэстамі заваблівау наведнікаў да стэнду нашай газеты. А потым р-раз — і лёгка сеў на шпагат! Дарэчы, з такога "танцавальнага па" пачыналася й ягоная нядаўняя творчая сустрэча ў Тураве. З Міколам Котавым знаёмыя і чытачы "Голасу Радзімы", некаторыя прымалі яго з выступленнямі ў сябе. Неаднойчы бываў танцор у Літве, Латвіі, Эстоніі, Польшчы, паездзіў па Расіі, двойчы гастраляваў па ЗША...



КАЦЯРЫНА МЯДЗВЕДСКАЯ

**З юбілеем Міколу Котава віншуюць артысты "Матулінай хаты"**

→ Стар. 4

СВЯТА

# Цвяток радзімы васілька

(Заканчэнне. Пачатак на стар. 1)

**“Песня рвецца і ліецца...”**

Вершы Максіма Багдановіча на працягу дня гучалі 9 снежня ў Мінску і ля помніка паэту — на плошчы Парыжскай камуны, ля Тэатра оперы і балета. У літаратурнай акцыі “Расцём разам з Максімам” удзельнічалі студэнты, выкладчыкі, работнікі музеяў, дзеячы культуры, медыяперсоны. 3 першых жа радкоў, вядомых яшчэ са школьных гадоў, успаміналіся яго “Зорка Венера”, “Слуцкія ткачыхі”, “Я хацеў бы спаткацца з вамі на вуліцы”, “Краю мой родны”, “Паміж пяскоў Егіпецкай зямлі...” Радасна было бачыць, што творчасцю Максіма Багдановіча захоплена і сённяшняя моладзь. Так пранікнёна, душэўна чыталі яны вершы з яго адзінага прыжыццёвага зборніка “Вянок”. Здавалася, студэнты БДУ, БДПУ імя Максіма Танка, чытаючы радкі, перажываюць тое, што адчуваў сам паэт. І голас пачынаў мацнець, рухі станавіліся ўпэўненымі… Дарэчы, сярод чытальнікаў, як я даведалася, былі навучэнцы энергетычнага факультэта БНТУ, гандлёвага каледжа... Так што паэзія Максіма Багдановіча — гэта не толькі спажыва для душы вытанчаных эстэтаў…

А сярод гледачоў, якія не спужаліся зімовае слоты, холаду, былі і выпадковыя: многія прыпыняліся паслухаць незвычайна прыгожыя, рамантычныя радкі багдановічаўскай паэзіі. А хтосьці ж даўно чакаў гэтую літаратурную сустрэчу, рыхтаваўся. Так, з кветкамі, узрушаная падышла да помніка паэту Іна Паўлаўна Апалонава, пенсіянерка, у мінулым — дзяячка кінамастацтва. Са слязьмі на вачах казала: “Спецыяльна прыйшла паслухаць вершы Багдановіча... Якая лірыка! Вельмі люблю яго паэзію”. Бачыла: задумваліся і многія з хлопцаў і дзяўчат, слухаючы “Жыве не вечна чалавек”, “Шмат у нашым жыцці ёсць дарог”, “Завіруху”.



БЕЛТА

Цырымонія “Вяртанне” адбылася ў мінскім Храме-помніку ў гонар Усіх Святых

Так мала пражыў Максім Багдановіч: усяго 25 гадоў 5 месяцаў і 16 дзён. А зрабіў многа! І чытаюць мінскія студэнты радкі з даўняга мінулага: “Больш за ўсё на свеце жадаю я, каб у мяне быў свой дзіцёнак. Маленькая дачушка-немаўляшка Аня Максімаўна. Такая прыгожанькая, цёпленькая, мокранькая, з чорнымі валосікамі і броўкамі, з цёмна-карымі вочкамі. А ручкі — як перацягнутыя ніткамі…” Ніколі не быў жанаты паэт, не пакінуў ён на гэтым свеце й сваё дзіцятка... Але, слухаючы вершы Багдановіча ў выкананні школьнікаў і студэнтаў, разумееш: у паэта і сёння шмат духоўных паслядоўнікаў, нашчадкаў ягонай жыццёвай праўды, ягонага разумення крысы і свету.

**“...Лепшай долі няма на зямлі...”**

Пра значэнне і актуальнасць творчасці класіка гаварылі й на адкрыцці абноўленай экспазіцыі Літаратурнага музея Максіма Багдановіча ў Мінску. Так, першы намеснік Міністра культуры Беларусі Ірына Дрыга казала: “Максім Багдановіч быў першацветам адраджэння беларускай культуры, фарміравання нашай сучаснай мовы, паэтам еўрапейскага ўзроўню. Уладальнік прыгожага таленту... Яго спадчына саграває нас і цяпер”.

Адкрыты ў 90-я гады мінулага стагоддзя музей паўстаў сёння ў новым абліччы. Дырэктарка музея Марына Запартыка казала: у пяці залах прадстаўлены асабістыя рэчы сям'і паэта. Ёсць і мультымедыйная частка экспазіцыі. Можна пагартаць на маніторы зборнік паэта, разгледзець ягоны радавод, паслухаць вершы, а таксама даведацца пра гісторыю кахання класіка, пра яго мінскі перыяд жыцця. Першы дырэктар музея, пісьменнік Міхаіл Пазнякоў дзяліўся ўспамінамі пра час, калі ствараўся музей, у ягоных планах — напісаць пра тое кнігу.

...Напрыканцы дня ў Мінску ля помніка Максіму Багдановічу прайшоў мітынг “Пакланіся Максіму”. Удзельнікі ўсенароднай акцыі ўсклалі кветкі да ног Паэта, быў сярод іх і вянок ад Прэзідэнта краіны.

**“...Светлы ж след будзе вечна жывым”**

Творы Максіма Багдановіча перакладзены амаль на 20 моваў свету, публікаваліся ў Вялікабрытаніі, Германіі, Расіі, Францыі, Югаславіі ды іншых краінах. Вуліцы яго імя ёсць у Мінску, Брэсце, Віцебску, Гомелі, Гродне, Магілёве, а таксама ў расійскіх гарадах Ніжнім Ноўгарадзе, Яраслаўлі, Ялце...

Мінскі помнік Максіму Багдановічу невыпадкова знаходзіцца ля Тэатра оперы і балета: праз вуліцу, непадалёк стаяў дом, дзе будучы паэт нарадзіўся. Унізе размяшчалася першая гарадская пачатковая школа, якой у 1885-91 гадах загадваў бацька паэта Адам Ягоравіч. На другім паверсе жыла сям'я. Той дом згарэў у Вялікую Айчынную...

Устаноўлены помнік паэту і ў расійскім Яраслаўлі, у скверы ля ўваходу ў галоўны корпус Дзямідаўскага ўніверсітэта. У 1957-м узведзены бюст паэту ў крымскім Місхоры, на тэрыторыі санаторыя “Беларусь”: на плошчы ля фантана.

Кожнае лета ў Ракуцёўшчыне, у Маладзечанскім раёне, дзе працуе філіял Літаратурнага музея Максіма Багдановіча, праходзіць свята “Ракуцёўскае лета”, прысвечанае памяці паэта. Музей яго імя ёсць і ў Гродне: заснаваны ў 1986 годзе ў доме, дзе жыла сям'я Багдановічаў. 3 1991 года дзейнічае Дом-музей у горадзе Яраслаўлі, там таксама жыла сям'я з 1912 па 1914 гады. 3 1995-га музей мае статус Цэнтра беларускай культуры.

На працягу ўсяго 2016-га ў бібліятэках краіны, на радыё і тэлебачанні, інтэрнэт-старонках розных устаноў праходзілі мерапрыемствы да акцыі “Чытаем Багдановіча разам”.

РАЗАМ

# Суседзі па Дзвіне

**У Днях Латвіі ў Віцебску паўдзельнічалі беларусы Даўгаўпілса**

Ладзілі Дні Латвіі ў Віцебску Упраўленне культуры Даўгаўпілскай гарадской думы ў супрацоўніцтве з Латвійскім консульствам у Віцебску і дзяржустановай Цэнтр культуры “Віцебск”. Гэта быў шэраг культурных мерапрыемстваў. 15 лістапада ў канцэртнай зале “Віцебск” адкрылася выстава твораў “Што ёсць ісціна?” Валдыса Буша. Мастак вядомы не толькі ў Латвіі: ягоныя працы пабывалі нават у Амерыцы, Аўстраліі, Афрыцы. У віцебскай экспазіцыі аўтар праз абстракцыю быццам шукае адказы на пытанні: а сонца бывае зялёным? А нябёсы бываюць жоўтымі? А трава бывае белая? Ну і хто можа сцвярджаць, паглядзеўшы выставу, што не!

Выставу адкрылі консул Латвіі ў Віцебску Угіс Скуя, прадстаўнік Віцебскага гарвыканкама Анатоль Мядзведскі, першы намеснік мэра Даўгаўпілса Яніс Дукшынскі, дырэктар Арт-цэнтра імя М. Ротка Аляксей Буруноў. На вернісаж прыйшло шмат зацікаўленых гледачоў.

А потым усіх аматараў року, добрай музыкі запрасілі на канцэрт гурта “ELPA” (перакладаецца як “дыханне”) з Даўгаўпілса. Група з'явілася ў 80-х і стала візітнай карткай горада ў музычным свеце Латвіі. Разам з рок-выканаўцамі выступалі ўжо знаёмая Віцебску спявачка, салістка Латвійскай нацыянальнай оперы Ілона Багелэ і малады спявак, дыпламант XXII Міжнароднага конкурсу выканаўцаў эстраднай песні Міжнароднага фестывалю мастацтваў “Славянскі базар у Віцебску” Аціс Іевіньш. Гучалі папулярныя песні 80-90 гадоў з рэпертуару групы, кампазіцыі Раймонда Паўлса. Гледачы цёпла сустрэлі артыстаў, на працягу канцэрта апладысменты не змаўкалі.

На наступны дзень наша дэлегацыя наведала музей-сядзібу “Здраўнёва”: там жыў і працаваў знакаміты мастак Ілья Рэпін. Прыгожая мясціна, пейзажы майстра, цікавы аповед экскурсавода. Потым была сустрэча ў Цэнтральнай гарадской бібліятэцы імя М. Горкага. У ёй паўдзельнічалі прадстаўнікі гарвыканкама, мясцовыя паэты Мікалай Наменскіх і Уладзімір Крайнеў, кіраўнік суполкі пажылых людзей “Залаты ўзрост” Міхаіл Лузгін. Прыйшло на сустрэчу шмат цікавых субяседнікаў. Мы расказалі пра суполку “Уздым”, гаварылі пра творчасць нашых паэтаў: Анастасіі Сазанковай, Людмілы Вілюма, Паўла Плотнікава, Зянона Бурага, Ірыны Страздонік-Плячко, Станіслава Валодзькі. Вершы іх чыталі Вольга Паўловіч і Людміла Сінякова.



СВЯТЛАНА МАРОЗАВА

Актывісты суполкі “Уздым” на сустрэчы ў Віцебску

Цікава выступілі і віцебскія паэты. Сустрэча прайшла цёпла, сардэчна. Было бачна: слухачам цікава, як жывуць беларусы ў суседняй краіне, як рэалізуць там нашы суплямennікі свае таленты. Пазней з дырэктаркай бібліятэкі Галінай Данілавай мы дамовіліся: прадоўжым стасункі.

Мы, беларусы Даўгаўпілса, удзячны за магчымасць паўдзельнічаць у свяце кіраўніцы аддзела культуры Даўгаўпілса Элеаноры Кляшчынскай, кіраўніцы аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Віцебскага гарвыканкама Наталлі Шыёнак, кіраўніцы аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Віцебскага аблвыканкама Галіне Баркевіч. А таксама за супрацоўніцтва кіраўнікам партала “Gorod. Vitebsk.by” Уладзіміру і Таццяне Лапіным.

**Таццяна Дзянісава,**
член праўлення таварыства “Уздым”, г. Даўгаўпілс

ВЕСТКІ

# Адзначаны актывісты

**Сябры Беларускага таварыства “Вербіца” ўшанаваныя ў Дагдзе**

У гонар Дня незалежнасці Латвіі ў Дагдскім народным доме прайшла ўрачыстасць. Ушаноўвалі людзей, якія добра папрацавалі на развіццё і ўслаўленне горада, Латвіі. Сярод іх і сябры суполкі “Вербіца”. У намінацыях “Грамадская актыўнасць” і “Праца ў самакіраванні” адзначаны адпаведна Арыя Клінтс і Ніна Тарака. Намінанты атрымалі ганаровыя граматы і прыгожыя шкляныя сувеніры з лазернай гравіроўкай. Было шмат кветак і апладысментаў.

Гэтыя нашы сяброўкі заўсёды імкнуцца зрабіць і больш, і лепш. Без іх энтузіязму ў нашай суполцы не было б такіх цікавых спраў. Вялікі вам дзякуй, паважаныя Арыя і Ніна, за спагадлівасць, разуменне і стараннасць. Мы ўдзячныя вам за вашы пазітыў і жыццялюбства. Дзякуй за энергічнасць, працавітасць, за вашую душэўнасць. Мы высока цэнім тое, што вы робіце.

**Таццяна Гогалінская,**
старшыня дагдскага Беларускага таварыства “Вербіца”

БЛІЗКІЯ ЛЮДЗІ

# Павіншавалі на роднай мове

Ураджэнец вёскі Поўна Горацкага раёна Магілёўшчыны Сяргей Кулікоў, які доўгі час быў нязменным старастам Беларускай грамады Львоўскай вобласці, адзначаў 85-гадовы юбілей разам з сябрамі-супляменнікамі



Сяргей Кулікоў з актывісткамі, самадзейнымі артысткамі беларускай суполкі Львоўскай вобласці

Пра юбілей нашага генерала мы, вядома ж, памяталі. 15 лістапада першае віншаванне па телефоне ён атрымаў ад старэйшыны, 89-гадовай Неаніла Платонаўны Ракаўчук. Яна ў нас дакладна ведае: калі, каму і сколькі. Вядзе вялікую картатэку. Гэта важны і адказны ўчастак працы ў грамадзе, і Неаніла Платонаўна цудоўна з ім спраўляецца. Да яе голасу, манеры віншаваць сяброў суполкі мы прывыклі. Яна ж не перастае здзіўляць нас пунктуальнасцю й бадзёрасцю. Як пазней стала вядома, пасля мноства пажаданняў беларускае імя СЯРГЕЙ ганаровага сябра грамады і яе шматгадовага кіраўніка па-руску было "расшыфравана" так: "Славный, Ясновидящий, Работоспособный, Галантный, Европейский, Идеальный".

85-годдзе Сяргея Кулікова стала добрай нагодай, каб сказаць яму цёплыя словы, сабрацца разам Радзе грамады, спевакам з нашага беларуска-ўкраінскага хору. Атмасфера ў зале, дзе ўшаноўвалі генерала, была вельмі беларускаю. Спачатку харысты песняй "Сёння ў нашай хаце свята" запрасілі гасцей Сяргея Уладзіміравіча да стала. Вядучая пад мелодыю "Беловежская пушча" зачытала ўрывак з аўтабіяграфічнай кнігі юбіляра "Памятное из прожитого", якая выйшла ў 2010 годзе. Там якраз апавядаецца пра сям'ю, дзяцінства, родныя мясціны Сяргея Уладзіміравіча ў Горацкім раёне. Мы нагадалі: юбіляр нарадзіўся ў вёсцы Поўна ў 1931 годзе, у 1952-м быў прызваны ў войска, прайшоў нялёгкі шлях ад салдата да генерала. Пры тым у 1956-м закончыў ваеннае вучылішча, а ў 1970-м — ваенную акадэмію. І пасля таго, як пайшоў у адстаўку, наш генерал не застаўся без "войска": з 1990 года ён актыўна ўдзельнічае ў жыцці беларускіх суполак Львоўшчыны. (Пра тое Сяргей Уладзіміравіч пісаў у нашай газеце: "Супольнай працай моцныя", 04.03.2015. — ***Рэд.***)

Тэкст нашага супольнага віншавання агучыла адна з паплечніц генерала ў грамадскай дзейнасці Людміла Дмітрышын. Яна шмат гадоў працуе ў грамадзе, гэта надзейны і адказны чалавек. На святочным плакаце з тэкстам, які мы падрыхтавалі, адлюстраваны моманты з жыцця суполкі, ёсць фотаздымкі ўсіх сяброў Рады. Потым госці паднялі тост за здароўе юбіляра. Павагу да сябе ён заслужыў уменнем правільна бачыць перспектыву, ацэньваць як людзей, так і сітуацыю і, галоўнае, адданым служэннем беларускай справе. Ён шмат зрабіў і робіць для наладжвання кантактаў з этнічнай Радзімай, умацавання стасункаў паміж дзвюма краінамі: як на ўзроўні асабістым, так і грамадскім.

На вечарыне прыгожа выступіў хор грамады, моладзевая група суполкі. Танцавалі нашу Лявоніху. Сяргей Уладзіміравіч атрымаў грамату ад Рады грамады: спецыяльна зрабілі да юбілею. Вітальны адрас даслаў новапрызначаны Амбасадар Беларусі ва Украіне Ігар Сокал. Юбіляр падзяліўся ўспамінамі, гісторыямі з жыцця, і мы ў чарговы раз пераканаліся ў яго неардынарным розуме, пачуцці гумару.

На юбілеі ўручаны граматы актывістам суполкі, прывезеныя з Усеўкраінскага з'езда беларусаў. Хутка праляцелі некалькі гадзін свята. А напрыканцы яго арганізатары — салістка хору Аксана Яськіў, Юры Газіеў, Святлана Мярзлова і я — пачулі шмат добрых слоў і пажаданняў.

Як бачым, традыцыя віншаваць адзін аднаго спрыяе згуртаванасці беларусаў Львоўшчыны, падахвочвае ўсіх нас праяўляць творчую энергію, ініцыятыву дзеля таго, каб і ў заходняй Украіне жылі беларускі дух і культура.

**Тамара Казак,** старшыня праўлення Беларускай грамады Львоўскай вобласці

**Ад рэдакцыі.**

Сяргей Кулікоў накіраваў пісьмовы зварот да дэлегатаў з'езду Саюза беларусаў Украіны, тэкст яго дасланы ў рэдакцыю. Паважаны актывіст беларускага руху ў замежжы павіншаваў супляменнікаў з падзеяй, пажадаў з'езду паспяховай працы. Нагадаў: у студзені 2015 года на сходзе сяброў грамады ён прапанаваў абраць яе старастам Тамару Мікалаеўну Казак, якая, на яго погляд, добра аналізуе сітуацыю, бачыць перспектыву і паспяхова спраўляецца з працай. Сяргей Уладзіміравіч у якасці справаздачы перад з'ездам расказаў пра некаторыя вынікі сумеснай працы беларусаў Львоўшчыны ў плыні шматлікіх гадоў. У канцы звароту чытаем: "Жадаю вам быць здаровымі, шчаслівымі ды мець шмат поспехаў ва ўсіх вашых справах і пачынаннях. Сваімі думкамі, душой і сэрцам я заўсёды буду разам з вамі".

Пра тое, як прайшоў 11 лістапада ў сталіцы Украіны чацвёрты з'езд Усеукраінскага саюзу беларусаў — мы яшчэ раскажам у бліжэйшы час.

Далучаемся да шматлікіх віншавання ў ваш адрас, паважаны Сяргей Уладзіміравіч! Спадзяемся, ваш каштоўны досвед працы на карысць Бацькаўшчыны будзе запатрабаваны ў розных суполках свету.

Дарэчы, мы яшчэ раз пагарталі падораную вамі рэдакцыі вельмі цікавую аўтабіяграфічную кнігу "Памятное из пережитого", для сябе адзначылі: пра вашу з паплечнікамі плённую працу ў Беларускай грамадзе Львоўскай вобласці там усяго толькі 6 старонак — з больш чым 300… Мы ўпэўнены: аповеды пра "беларускі Львоў", пра актывістаў беларускай суполкі, яе шматлікія справы заслугоўваюць і асобнага выдання.

ЯК СПРАВЫ, ДЫЯСПАРА?

# Наваселле ў Сыктыўкары



Юныя ўдзельнікі беларускіх Дажынак у Сыктыўкары

**У новым Доме дружбы, пабудаваным у сталіцы Рэспублікі Комі, актыўна абжываецца і беларуская суполка**

Наша Беларуская нацыянальна-культурная аўтаномія ў Рэспубліцы Комі ў наступным годзе адзначыць 20-годдзе. З першых дзён стварэння суполкі мы ўключыліся ў "беларускую працу". Разумелі: патрэбны творчыя калектывы. І ўжо ў 1998-м выходзіў на сцэну хор "Купалінка", які ў рэспубліцы стаў народным. Хор цяпер выступае ў прыгожых нацыянальных касцюмах, а што за песні! Дарэчы, яго ўсе кіраўнікі былі — з кансерваторскай адукацыяй. Прычым у розных кансерваторыях вучыліся: Валянціна Іванаўна Маскаленка — у Мінскай, Святлана Юр'еўна Сямяшкіна — у Петразаводскай, Аксана Анатолеўна Франоўская — у Свярдлоўскай, а Наталля Пятроўна Масанава — у Маскоўскай. З гэтага года харам кіруе Марыя Кротава, выпускніца Петразаводскай кансерваторыі. У хоры 15 чалавек, у тым ліку і яго ветэраны Зінаіда Губер, Галіна Балюй, Лілія Волкава, Лідзія Шапашнікава, Аляксандр Кульбянкоў.

Актыў суполкі да красавіка 2015 года ўзначальваў я, цяпер сябры надалі мне званне ганаровага старшыні. А на чале — Андрэй Лазіцкі, у яго намеснікі: Валянцін Бабошкін, Аляксандр Кір'янаў, Любоў Шубянок. У актыве яшчэ Галіна Сізых, Фёдар Барсукоў, Феафан Панько, Ганна Федарэнка, Мітрафан Курачкін. Суполка ладзіць, праводзіць шмат розных мерапрыемстваў: і культурных, і дзелавых. Беларусаў запрашаюць на вечарыны, сустрэчы рэспубліканскага маштабу. Аднак для плённай працы трэба мець, як кажуць беларусы, і свой кут, памяшканне. Тыя, што нам выпучалі раней, былі не ў лепшых месцах. А хацелася — бліжэй да культурнага цэнтра, іншых этнасуполак. Раней шы Дом дружбы не меў дастатковых плошчаў: свае святы, вечарыны мы праводзілі там у зале на 40-45 чалавек. Нас жа — больш, а калі яшчэ й сяброў запрасіць… Даводзілася чакаць, што ў новым Доме дружбы і нам знойдзецца месца.

І вось 4-павярховы будынак нядаўна ўведзены ў строй: у цэнтры горада, побач з Домам главы Рэспублікі Комі. Увесь другі паверх аддадзены пад Дом дружбы, офісы для ўсіх нацыянальных аўтаномій, буйных этнааб'яднанняў. Там і зала для правядзення сходаў на 200 чалавек, памяшканні для рэпетыцый, пад бібліятэку, касцюмерныя… Для этнасуполак — вялікі падарунак! Створаны ўсе ўмовы для плённай працы, і — на бясплатнай аснове для аўтаномій. Усе этнасуполкі суседзяць пад адным дахам: сталі жыць адзінай сям'ёй.

Беларусы адныімі з першых абжываюць новыя плошчы, правялі свята Дажынкі. Запрасілі на яго актывістаў іншых этнасуполак, зрабілі моцны, прыгожы агульны канцэрт. Падрыхтавалі выставу дароў прыроды і нацыянальных страў. І ўсім калектывам-удзельнікам свята ўручалі прызы-падарункі. Так што Дажынкі нашы прайшлі як мае быць. Добрыя словы, якія чулі ад усіх, беларусы заслужылі.

У сваім памяшканні мы ўжо размясцілі мэблю, кнігі, сувеніры, дзяржаўную сімволіку, зрабілі фотастэнд. Цяпер у "Беларускай хатцы" жыве беларускі дух! А ў такіх умовах і працаваць хочацца яшчэ лепш. Мы дзякуем кіраўніку Рэспублікі Комі Сяргею Гаплікаву за нашае наваселле, за клопат і ўвагу да патрэб этнасуполак. У нас ёсць кантакт і для далейшай сумеснай працы.

**Аркадзь Крупенька,** ганаровы старшыня Беларускай нацыянальна-культурнай аўтаноміі ў Рэспубліцы Комі

ТАЛЕНТЫ

# Карцін святочны феерверк

## Выставай "Уражанні беларускіх мастакоў у Балтыі" адзначыла свой 25-гадовы юбілей у Рызе вядомая творчая суполка "Маю гонар"

Творчыя почыркі ў супляменнікаў, што ствaрылі ў 1991 годзе ў Рызе Аб'яднанне мастакоў-беларусаў Балтыі "Маю гонар", самыя розныя. Аднак усе яны маюць гонар належаць да беларускага свету. І не хаваюць таго, жывучы ў Эстоніі, Латвіі, Літве ці Швецыі. З нагоды юбілею суполкі яны і зладзілі выставу ў галерэі Асацыяцыі нацыянальных культурных таварыстваў Латвіі імя Іты Казакевіч. Вернісаж быў 17 лістапада.



На святочным вернісажы выступае кіраўнік суполкі Вячка Целеш (злева)

Старшынюе ў аб'яднанні паранейшаму Вячка Целеш: мастак, даследчык беларускай гісторыі, культуры і мастацтва, грамадскі дзеяч. Гэта чалавек вялікай душы і вялікай адказнасці за справу, якой даўно займаецца. Дзякуючы яму ды яго ным паплечнікам і зладзілася прыгожая, цёплая імпрэза. Свята сабрала як мастакаў, так і аматараў мастацтва, якім блізкая да таго ж беларуская мова, нашы песні. Сімвалічна, што вернісаж прайшоў напярэдадні 98-й гадавіны абвяшчэння Латвійскай дзяржавы: дзень 18 лістапада — светлы і святы для кожнага грамадзяніна Латвіі. Карціны беларускіх мастакоў — гэта як святочны феерверк, прыгожы падарунак Латвіі.

На выставе сабраны творы 23-х мастакоў суполкі з Латвіі, Літвы, Эстоніі, выкананыя ў розных тэхніках: жывапіс, графіка, фотамастацтва. Латвію прадстаўляюць Ганна Пейпіня, Надзея Ізянёва, Аліна Літвіненка, Ірына Трумпель-Сабалеўская, Алена Раманенка, Вольга Кажамяка, Ірына Кароль, Тамара Насенка, Людміла Жэлабоўская, Алена Ціхамірава, Васіль Малышчыц, Анатоль Ермаковіч, Пётр Худабчонак, Лявон Маствілішскі ды Вячка Целеш. З Літвы — працы Алега Аблажэя, які, на жаль, сёлета адышоў у іншы свет. Яго творы, а таксама свае на выставу прывезла Крысціна Балаховіч. З Эстоніі прынялі ўдзел у выставе Маргарыта Астравумава, Генадзь Курлянкоў і Людміла Прыбыльска, са Швецыі — Кацярына Осберг і Ян Кузміцкі.

Звычайна святы ўпрыгожваюцца жывымі кветкамі, на якія Рыга вельмі шчодрая. І падалося мне пад час вернісажу: на нейкі момант хараша пайдналіся кветкі віншаванняў у руках мастакоў і кветкі на палотнах, жыццё якім далі працавітыя пэндзлі. У кожным позірку ўдзельнікаў імпрэзы ззяла ўдзячнасць за падараванае свята, за сустрэчу з высокім мастацтвам, а яшчэ й гонар за нашу агульную Радзіму-Беларусь.

Як і належыць, госці прыйшлі з падарункамі. Музычнае віншаванне прысвяціў мастакам маэстра Рафі Хараджанян, гаспадар у галерэі. Упрыгожыў свята і Алесь Камоцкі з Мінска — паэт, спявак, сябар Згуртавання беларусаў свету "Бацькаўшчына". Ён спяваў вядомы раманс "Зорка Венера" на верш Максіма Багдановіча, іншыя цудоўныя творы. Алесь зачытаў віншаванне, якое даслала юбілярам "Бацькаўшчына". Выставу не пакінула без увагі Амбасада Беларусі ў Латвіі: з віншаваннем і пажаданнем творчых поспехаў звярнуўся да мастакоў Аляксандр Сушкевіч, Першы сакратар Амбасады. Віншавалі мастакоў сябры, знаёмыя: ад Латвійскага таварыства беларускай культуры "Сьвітанак" — старшыня суполкі Ірына Кузміч, ад супляменнікаў Даўгаўпілса — кіраўніца Цэнтра беларускай культуры Жанна Раманоўская. Пры падтрымцы Мінкультуры Латвіі, рыжскай Думы, беларускіх прадпрымальнікаў да юбілею выйшаў цудоўны буклет, яркая афіша, былі разасланыя прыгожыя запрашэнні.

Увесь вечар у святочнай зале панаваў прыўзняты настрой, гучала музыка. Час праляцеў хутка, ды сябры не хацелі разыходзіцца. Былі да месца размовы, песні, мары, святочныя напоі ды найсмачнейшыя ў свеце дранікі. А заключным акордам вечарыны прагучалі родныя песні ў выкананні гурта "Вытокі".

Дарагія мастакі, з юбілеем вас! Здароўя вам, гармоніі ў душах, і мноства светлых колераў у палітры вашых жыццяў, і мноства прыемных паўтонаў у палотны вашых лёсаў!

**Ганна Іванэ,**
дырэктарка Рыжскай беларускай асноўнай школы імя Янкі Купалы

ЛІНІЯ ЖЫЦЦЯ

# У танцы раскрываецца душа

**(Заканчэнне. Пачатак на стар. 1)**

А да вядомасці, прызнання ўраджэнцу палескай Рэчыцы давялося ісці праз церні. Цяжкае дзяцінства выпала на долю: ніколі не бачыў бацьку. Той за чатыры месяцы да нараджэння сына пайшоў на вайну. Доўга не ведаў Мікола Конанавіч, дзе пахаваны родны чалавек. Дапамаглі сябры: Валянціна Смольнікава і кіраўніца клуба ветэранаў "Насустрач душы" з гарадскога пасёлка Уваравічы Любоў Родава. Аказваецца, Конан Котаў на стыку 1941-42 гадоў трапіў у палон, затым у канцлагер, дзе і загінуў. Пад Баранавічамі, на Брэстчыне, ёсць стэла з надпісам "Загінулыя палонныя". Там у брацкай магіле і пахаваны ягоны бацька. Якому Мікола Конанавіч прысвяціў песню "Я не бачыў цябе".

Цесная духоўная повязь у юбіляра і з маці. Часта згадвае яе, успамінае, як прыгожа спявала. Кажа: з тых спеваў і пачаўся ён як артыст. Ні Гомельскае чыгуначнае вучылішча, ні цяжкая праца механізатарам на цаліне, у казахстанскіх стэпах пад Карагандой, не адбілі жадання танцаваць. І як вярнуўся ў Беларусь, то пайшоў вучыцца на танцмайстра ў Гомелі. Закончыў яшчэ Інстытут культуры (цяпер — Белдзяржуніверсітэт культуры і мастацтваў) па спецыяльнасці рэжысёр тэатралізаваных масавых святаў. Цяпер навучае студэнтаў, выкладае ў тым жа ўніверсітэце, на кафедры рэжысуры абрадаў і святаў. Кажа: словам можна й схлусіць, а вось якраз у танцы найпаўней раскрываецца душа.

Адметная пара ў ягоным жыцці — праца ў Тураве. Заснаваў там ансамбль "Прыпяць": яму ўжо 52 гады, мае званне "народнага". Таму і ў Тураве прайшла творчая вечарына Міколы Котава. Выступалі на ёй яго першыя вучні, артысты "Прыпяці". Некаторыя ехалі з Масквы, Санкт-Пецярбурга, Мінска, Гомеля...

Не змаўкаў тэлефон Міколы Конанавіча і на яго юбілеі ў Мінску. "З чатырох раніцы прымаю віншаванні, — усміхаўся юбіляр. — Сябры, калегі, студэнты… Усе жадаюць здароўя, плёну, поспехаў". І ўсё тое спатрэбіцца аптымісту-танцору, якому і ў 75 на месцы не сядзіцца. Планаў шмат! З артыстамі "Матулінай хаты", якія, бадай, усе ў паважаным узросце, хутка збіраюцца калядаваць, потым — Масленіцу святкаваць, Вясну гукаць... На такіх масавых святах цікава ўсім! Гляньце відэаролік на партале https://www.youtube.com — пабачыце, як сёлета на Дзень Незалежнасці прайшліся котаўскія артысты па новым мінскім



ЯЎГЕН ПЯСЕЦКІ

Тэатр фальклору "Матуліна хата" — удзельнік розных святаў

мікраёне Брылевічы. З бубнам, свістулькамі, танцамі-прыпеўкамі. Сустрэчныя прыпыняліся, а нехта й падпяваў, падтанцоўваў. "У тым і сэнс такой дзеі: захапіць, уразіць, далучыць да свайго настрою", — упэўнены Мікола Котаў. Шмат ездзяць артысты і па краіне, выступаюць у школах, дзіцячых садках: "Дзіцянятка шчырае, акрытае: упусціць у сэрца музыку — з ёй і будзе далей крочыць па жыцці. Таму любоў да роднай песні, танца, музыкі варта прывіваць з маленства". Ужо рыхтуе Мікола Конанавіч гульнёвыя праграмы для школьнікаў: "Жавароначкі" і "Ой, Вясна-вяснулечка!", у якіх вобразнаю моваю прадставіць абуджэнне прыроды, прылёт жаўранкаў. Будзе там аповед пра "Гуканне Вясны", Масленічныя забавы ды Юр'еўскія карагоды.

Хочацца таленту-самародку стварыць і дзіцячы танцавальны гурт: "Эх, каб гэта навучыць малых чачотку выстукваць, роднае слова, песню сэрцам адчуваць, перадаць ім сваю любоў да народнай творчасці…". Так што, перафразуючы вядомы выраз, пажадаем Міколу Конанавічу, каб у 75 жыццё ягонае яшчэ толькі пачыналася.

ВЕСТКІ

# Вялікае кальцо

**Завяршаецца будаўніцтва чарговага ўчастка другой кальцавой аўтадарогі вакол Мінска**

Увесці ў эксплуатацыю новы ўчастак плануецца да канца снежня. Працягласць МКАД-2 складзе 160 кіламетраў. А нядаўна намеснік Прэм'ер-міністра Анатоль Калінін знаёміўся з ходам будаўніцтва. Яно, нагадаем, вядзецца ад аўтадарогі М-6 Мінск — Гродна да М-1/Е30 Брэст — Мінск — мяжа Расіі. Прэсслужба Саўміна паведаміла: працы цяпер на завяршальным этапе. Ужо гатова дарожнае палатно, заканчваецца ўладкаванне дарогі, яе вонкавае добраўпарадкаванне. Ёсць усе падставы спадзявацца: важны гэты аб'ект будзе ўведзены ў эксплуатацыю своечасова. Анатоль Калінін зрабіў неабходныя даручэнні, каб завяршыць працы да 20 снежня. Цяпер ідзе мантаж бар'ернай агароджы, установка сетак паўз дарогі ад дзікіх жывёл, прыбіраюцца высечныя парэшткі.

З тых 160 кіламетраў, якія мець будзе МКАД-2, 88 кіламетраў — гэта нанова пабудаваныя ўчасткі. Разліковая хуткасць руху па новай магістралі будзе 120 кіламетраў у гадзіну. Новыя часткі маюць бетоннае пакрыццё, сама ж траса пракладзена па магчымасці далей ад населеных пунктаў, садаводчых таварыстваў і без зносу будынкаў.

**Заснавальнік:** Установа Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «Рэдакцыя газеты «Советская Белоруссия». Вул. Б. Хмяльніцкага, 10а, 220013, Мінск
**Рэдактар** Віктар Міхайлавіч Харкоў
**Адрас рэдакцыі:** пр. Незалежнасці, 44, Мінск, 220005
**Рэгістрацыйнае пасведчанне № 61.** Выдадзена 2 сакавіка 2009 г. Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь
**Бюро па рэкламе:** Тэл. +375 17 290 60 11
**Тэлефон рэдакцыі:** +375 17 288 17 82; факс: +375 17 290 68 31
**E—mail:** golas_radzimy@tut.by
**Аб'ём выдання:** 1 друк. арк.
**Тыраж:** 1935, **Заказ:** 1837
**Час падпісання ў друк:** 20.10
Выходзіць 1 раз на тыдзень
Газета надрукавана на Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП №02330/106 ад 30.04.2004. Праспект Незалежнасці, 79, 220013, Мінск
Пазіцыі рэдакцыі і аўтараў, матэрыялы якіх друкуюцца на старонках "Голасу Радзімы", могуць не супадаць.
© "Голас Радзімы", 2016